*Бігеза В.М. (Мінск)*

# ПРАФЕСІЙНАЯ ПАДРЫХТОЎКА БІБЛІЯТЭЧНАГА СПЕЦЫЯЛІСТА ПА РАБОЦЕ З ДЗЕЦЬМІ: САЦЫЯКУЛЬТУРНЫ АСПЕКТ

Шматаспектнасць сучасных патрабаванняў да будучых спецыялістаў па рабоце з дзецьмі ва ўстановах культуры прадугледжвае і сацыякультурны кірунак.

Паняційнае тлумачэнне самога тэрміна *"сацыяльна-культурная дзейнасць"* разглядаецца навукоўцамі шматгранна. Мы больш пагаджаемся з вызначэннем, дадзеным Л.П.Буевай, якая лічыць, што дзейнасць – гэта працэс рэалізацыі сацыяльнай актыўнасці, паколькі "сутнасць чалавека значна багацей, markdown разнабаковей і складаней, чым толькі сістэма яго дзейнасці".

Сацыяльна-культурная дзейнасць мае свае адметныя асаблівасці: здзяйсняецца ў свабодны час, вызначаецца ініцыятывай пэўных асоб, груп, свабодай выбару, актыўнасцю, асабістымі жаданнямі ўдзельнікаў. Неабходна падкрэсліць разнастайнасць відаў сацыяльна-культурнай дзейнасці, якія грунтуюцца на прафесійных, мастацкіх, пазнавальных, сямейных і іншых інтарэсах розных слаёў насельніцтва, у тым ліку і дзяцей.

Як вядома, у сацыяльна-культурнай дзейнасці ўдзельнічаюць сёння шматлікія сацыяльныя інстытуты, да якіх належыць і бібліятэка. Гэта абгрунтавана такімі навукоўцамі, як Н.В.Жадзько, Р.С.Матульскі, Е.Т.Селіверстаў, А.В.Сакалоў, Ю.М.Сталяроў, В.Р.Фірсаў. У артыкуле 3 закона "Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь" бібліятэка вызначаецца як сацыяльна-культурны і інфармацыйны інстытут грамадства.

Сацыяльна-культурная дзейнасць бібліятэк можа адбывацца і адбываецца ў кірунку сацыялізацыі асобы.

Адносна дзяцей, падлеткаў і моладзі сацыяльнае выхаванне разглядаецца навукоўцамі як сістэма, якая педагагічна арыентавана і мэтазгодна накіравана на грамадскую дапамогу названым катэгорыям у перыяд іх уваходжання ў сацыяльнае жыццё.

На нашу думку, будучыя бібліятэчныя спецыялісты па рабоце з дзецьмі змогуць атрымаць неабходныя веды, уменні і навыкі ў гэтым кірунку праз вывучэнне комплексу *"Дзіцячая літаратура"*. Аб важнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

такой падрыхтоўкі будучых спецыялістаў па рабоце з дзецьмі сведчыць даследаванне НББ *"Структура і дынаміка дзіцячага чытання ў Рэспубліцы Беларусь (1994–1997 гг.)"* з удзелам БДУ культуры на этапе збору інфармацыі. У ходзе даследавання была атрымана карціна структуры вольнага часу дзяцей і вызначана месца чытання ў ім. Згодна з даследаваннем, па ўсяму масіву 1-е месца ў вольным часе дзяцей-чытачоў бібліятэк належыць чытанню (74%), а ў сітуацыі па падмасівах розных населеных пунктаў 1-е месца займае пазіцыя "зарабляю грошы". Па нашаму меркаванню, трывожны той факт, што паэзія апынулася амаль на апошнім месцы ў чытанні дзяцей. Думаецца, што адкрыццё Рэспубліканскай дзіцячай бібліятэкі ў нашай краіне садзейнічала б вырашэнню гэтай задачы, як і мноства іншых, у тым ліку і падрыхтоўкі высокапрафесійных кадраў для работы з дзецьмі.

У працэсе выкладання такіх дысцыплін, як *"Бібліяграфія літаратуры для дзяцей і юнацтва"*, *"Краязнаўчая бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць дзіцячых бібліятэк"*, *"Фарміраванне бібліятэчна-бібліяграфічнай культуры дзяцей і юнацтва"*, *"Бібліятэка ў сістэме экалагічнай адукацыі"* мы імкнемся выхоўваць у студэнтаў тыпалагічныя ўзроўні сацыяльна-культурнай дзейнасці рэпрадуктыўна-творчы і рэпрадуктыўны. Здзяйсняецца гэта пры правядзенні семінарскіх, практычных, лабараторных заняткаў, у ходзе якіх студэнты выпрацоўваюць уменні і навыкі, авалодванне якімі дазволіць ствараць і выкарыстоўваць, напрыклад, аўтарскія праграмы для сямейных чытанняў, урокі літаратурных гульняў, арганізоўваць працу разнастайных гурткоў, клубаў па інтарэсах, ствараць сцэнарыі па розных кірунках бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці з дзецьмі, бацькамі, настаўнікамі. Па нашаму меркаванню, мэтазгодным пры правядзенні заняткаў з'яўляецца вывучэнне стану і класіфікацыі дасугавых электронных гульняў, магчымасці іх выкарыстання ў тым ці іншым кірунку дасугавай дзейнасці.

Сёння адбываецца адраджэнне нашай нацыянальнай культуры, гістарычнай памяці. Іадным з напрамкаў сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк у гэтым аспекце з'яўляецца арганізацыя і правядзенне своеасаблівых народных свят з выкарыстаннем мясцовых звычаяў, фальклору, традыцый. Тут могуць быць распрацаваны праграмы для дзяцей па краязнаўстве, традыцыйныя і электронныя варыянты бібліяграфічных дапаможнікаў, створаны краязнаўчыя клубы, плённым з'яўляецца і супрацоўніцтва з краязнаўчымі школьнымі і мясцовымі музеямі.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Важным напрамкам у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў па рабоце з дзецьмі, звязаным з краязнаўствам, з'яўляецца фарміраванне экалагічнай культуры. Выкарыстанне студэнтамі такіх ведаў, уменняў і навыкаў дасць свой плён пры арганізацыі і правядзенні розных форм дасугавай дзейнасці ў бібліятэцы (літаратурныя вечары, літаратурныя чытанні, чытацкія канферэнцыі, бібліяграфічныя агляды, інфармацыйныя паведамленні і інш.).

У наш час шматлікія сацыяльна-культурныя ўстановы імкнуцца ўздзейнічаць на сям'ю як галоўную састаўляючую ў галіне выхавання і living разнабаковай змястоўнай дзейнасці ў сферы культуры і вольнага часу.

Навукоўцы лічаць, што сацыяльна-культурная дзейнасць эфектыўная, калі яна накіравана на сям'ю як на супольнасць. Бібліятэка мае сваю нішу ў гэтым кірунку – гэта клубы сямейнага чытання, падлеткавыя клубы і, нарэшце, бібліятэкі сямейнага чытання. Для працы з такім кантынгентам бібліятэчныя спецыялісты павінны быць усебакова падрыхтаваны: умець праводзіць на высокім узроўні кансультацыі, гутаркі з бацькамі, бібліяграфічныя агляды, чытаць лекцыі з мэтай павышэння педагагічнай культуры бацькоў, іх начытанасці, зацікаўленых адносін да чытання сваіх дзяцей і выкарыстання імі бібліяграфічнай інфармацыі. Асаблівай увагі ў структуры сямейнага дасуга патрабуюць у наш час падлеткі. Як вядома, псіхолага-педагагічныя асаблівасці гэтага ўзросту абумоўлены бурным псіхафізіялагічным ростам і характарызуюцца імкненнем да набыцця разнабаковага вопыту, спробай ідэнтыфікаваць сябе ў грамадстве.

Сістэма рэкамендацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэкі прадугледжвае не толькі комплекс мерапрыемстваў, але і вывучэнне бібліяграфічных патрэбнасцей бацькоў, узроўню іх інфармацыйнай культуры. Для больш грунтоўнай падрыхтоўкі студэнтаў у гэтым кірунку на лабараторных занятках, заданнях для самастойнай працы ў курсе *"Бібліяграфія літаратуры для дзяцей і юнацтва"* студэнты распрацоўваюць планы-праспекты, сцэнарыі асобных мерапрыемстваў, адрасаваных бацькам і дзецям.

Неабходна таксама падкрэсліць значнасць бібліятэчнай практыкі як асновы бібліятэчнай адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ